Экспазіцыю паштовых марак Рэспублікі Беларусь ацанілі на міжнародным узроўні

25 кастрычніка 2018 года Олфа Макаддэм, кіраўнік па праграмах філатэліі і міжнародных купонаў у адказ Сусветнага паштовага саюза прадставіў вынікі 15-га конкурснага класа па філатэліі, які адбыўся ў Макао (Кітай) падчас правядзення 35-й Міжнароднай Азіяцкай філатэлістычнай выставы «Макао 2018».

За тэматычную экспазіцыю РУП «Белпошта» прысуджаны срэбраны медаль у групе В (краіны, якія выпускаюць ад 30 да 69 паштовых марак у год).

Гэта ўзнагарода сведчыць аб высокай якасці беларускага філатэлістычнага матэр'ялу. Залатога медаля ўдастоены Уругвай, бронза - у Ватыкана.

Міжнародная Азіяцкая філатэлістычная выстава праводзіцца рэгулярна з 1977 года. У перыяд з 21 па 24 верасня прайшла выстава Макао-2018, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі з 23 краін. Кожны з чатырох дзён выставы меў асноўную тэматычную накіраванасць: Паштовы ашчадны дзень, Дзень паштовай маркі, Дзень пісьма і Святочны дзень.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/26-10-2018-3656*